Казакоў, Л. Ю. Валочная памера ва ўладаннях каралевы Боны і яе значэнне ў далейшай рэарганізацыі сельскай гаспадаркі / Л. Ю. Казакоў // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 2 / рэдкал. У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.] – Мн: БДУ, 2007. – С. 125–128

*Л. Ю. КАЗАКОЎ*

# ВАЛОЧНАЯ ПАМЕРА ВА ЎЛАДАННЯХ КАРАЛЕВЫ БОНЫ І ЯЕ ЗНАЧЭННЕ Ў ДАЛЕЙШАЙ РЭАРГАНІЗАЦЫІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

Да сярэдзіны XVI ст. перамер зямлі на валокі і ўсталяванне фальваркаў на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага праходзілі эпізадычна. Першая масавая валочная памера была праведзена Бонай Сфорца ў сваіх уладаннях (Пінскае і Клецкае княствы) у перыяд з 1552 да 1555 г., бо ранейшая сістэма землекарыстання і абкладання павіннасцямі сялян была недасканалай. Яна абапіралася на разнародныя адзінкі падаткаабкладання, што давала магчымасць сялянам утойваць сельскагаспадарчыя ўгоддзі ад землеўласніка. Гэта тармазіла працэс накаплення капіталу і перашкаджала стварэнню фальваркаў — новай формы гаспадарання, цалкам заснаванай на прыгоннай працы.



У той жа час на еўрапейскім рынку пачалася «збожжавая гарачка», таму продаж збожжа ў Еўропу стаў надзвычай прыбытковым. Амаль уся прадукцыя фальваркаў ішла на продаж, ад чаго мелі карысць і землеўласнікі, і дзяржава.

Валочнай памеры каралевы Боны папярэднічала праверка правоў на зямлю, якая дазволіла павялічыць яе ўладанні за кошт тых зямель, якія незаконна знаходзіліся ва ўласнасці шляхты. Аграрная рэформа ў Пінскім і Клецкім княствах, што належалі каралеве Боне, пачалася вясной 1552 г., але яшчэ ў 1549—1550 гг. у частцы яе ўладанняў быў праведзены перамер зямлі на валокі. Праўда, тады перамер быў накіраваны перш за ўсё на ўпарадкаванне падаткаабкладання, а не на стварэнне фальваркаў [1].

Такім чынам, першай паўнавартаснай валочнай памерай у межах пэўнага рэгіёна трэба лічыць аграрную рэформу каралевы Боны ў Пінскім і Клецкім княствах. Яна праводзілася па спецыяльнай уставе, якая ўтрымлівала ў сабе асноўныя прынцыпы рэарганізацыі сельскай гаспадаркі. Устава была адрасавана асобам, адказным за перамер зямлі на валокі. На чале іх стаяў пан Станіслаў Хвальчэўскі. Уводзілася агульная зямельная адзінка — валока. Яна магла мець памер толькі 30 моргаў і падзялялася на тры полі. Тым самым уводзілася абавязковае трохполле. Ліквідавалася цераспалосіца. Калі зямля, якая належала іншым землеўласнікам, у тым ліку і царкве, падпадала пад валокі, то яна адбіралася і ацэньвалася, а па заканчэнні аграрнай рэформы землеўласнікам даваліся зямельныя ўчасткі, якія па колькасці і якасці адпавядалі ранейшым. У тым выпадку, калі немагчыма было даць участак зямлі, цалкам адпаведны ранейшаму, то розніца кампенсавалася надбаўкай. Недахопам уставы было тое, што каралевай Бонай не былі дадзены канкрэтныя параметры, якімі павінны былі кіравацца асобы, што праводзілі валочную памеру на месцы пры абмене ўчасткаў. Таму шмат чаго залежала ад Станіслава Хвальчэўскага і яго падначаленых. Але звычайна інтарэсы землеўласнікаў не закраналі пры абмене. Калі ж хто-небудзь з іх заставаўся незадаволеным вынікамі абмену і ўсяляк імкнуўся выкарыстоўваць адабраны ўчастак, то яго дзеянні класіфікаваліся як злачынства, і ён атрымліваў адпаведнае пакаранне [2].

У кожным маёнтку, які меў для гэтага неабходныя ўмовы, стваралася так званая дваровая пашня, памерам у некалькі валок (іх колькасць залежала ад мясцовасці). Эксплуатацыя пашні была немагчыма без неабходнай колькасці рабочых рук. Каралева Бона адмовілася ад ужывання працы чэлядзі нявольнай для апрацоўкі пашні. На кожны маёнтак была адведзена пэўная колькасць валок, трымальнікі якіх павінны былі апрацоўваць дваровую пашню. Устава каралевы Боны выдзяляла некалькі катэгорый сялян. Умоўна іх мож-



на класіфікаваць у вышэйшы і ніжэйшы разрады. Вышэйшы — прывілеяваны — разрад складалі сяляне, якія выконвалі пэўную спецыяльную службу ў маёнтку. Да іх адносіліся кавалі, падлазнікі, баброўнікі і калеснікі. За сваю працу яны атрымлівалі валокі, поўна ці часткова вызваленыя ад натуральных і грашовых павіннасцей. Другі разрад складалі тры групы сялян: сяляне цяглыя, асадныя і чэлядзь нявольная. Цяглыя сяляне павінны былі адпрацоўваць па два дні паншчыны з валокі. Акрамя гэтага, яны плацілі фіксаваны чынш. Памер чыншу вызначаўся па якасці глебы. Выдзяляліся тры катэгорыі глебы: добрая, сярэдняя і злая. Пры гэтым для ўсіх трох катэгорый заставалася нязменнай колькасць жыта, што ўваходзіла ў чынш, — эквівалентная 10 грошам. Асадныя сяляне былі вызвалены ад цяглай службы, але яны павінны былі плаціць чынш прыкладна ў 2 разы больш за цяглых сялян. Акрамя таго, і асадныя і цяглыя сяляне павінны былі 6

разоў на год адпрацоўваць талокі, выконваць падводную павіннасць і выплачваць стацыю — надзвычайны падатак, які накладаўся на сялян у выпадку прыезду каралевы. Пры маёнтках працягвала існаваць і чэлядзь нявольная. Але яе праца перастае быць эфектыўнай. Пазней, ва «Уставе на валокі», гэта катэгорыя сялян была пераведзена ў агароднікі.

Уладанні каралевы Боны ў Пінскім і Клецкім княствах падзяляліся на войтаўствы — адміністрацыйныя адзінкі, створаныя шляхам злучэння некалькіх вёсак пад уладай войта. Акрамя таго, валочная памера ўрэгулявала падаткаабкладанне гарадоў і мястэчак, якія належалі каралеве Боне. Так, землі, занятыя пад пабудовы, абкладаліся падаткам у памеры трох пенязяў з прута; землі, занятыя пад агароды, — васьмі грошаў з морга.

Валочная памера каралевы Боны была праведзена ў максімальна кароткі час — на працягу трох гадоў (1552—1555 гг.). Нягледзячы на тое, што яна закранала інтарэсы як сялян, так і шляхты, аграрная рэформа не выклікала актыўнага супрацьдзеяння. Бона Сфорца змагла паспяхова правесці замену старых форм землекарыстання на больш дасканалыя новыя. Гэта дазволіла павялічыць прыбыткі са сваіх уладанняў. Фальваркава-паншчынная сістэма на беларускіх землях даказала сваю эфектыўнасць. Устава каралевы Боны была добрым прыкладам па правядзенні аграрнай рэформы. Але яна паказвала толькі асноўны накірунак у рэарганізацыі сельскай гаспадаркі. Складальнікі ж «Уставы на валокі» шмат у чым дапрацавалі і ўдасканалілі прынцыпы, на якіх базіравалася ўстава каралевы Боны. У выніку атрымалася дасканалая інструкцыя па правядзенні валочнай памеры.

Такім чынам, валочную памеру ва ўладаннях каралевы Боны можна лічыць удалым эксперыментам па ўнясенні перадавых дасягненняў сель-



скай гаспадаркі Заходняй Еўропы на беларускую глебу, а таксама прэлюдыяй да правядзення аграрнай рэформы ў межах усяго Вялікага княства Літоўскага.

---

[1] *Голубеў В. Ф.* Сялянскае землеўладанне і землекарыстанне на Беларусі XVI—XVIII стст. Мн., 1992.

[2] *Пичета В. И.* Белоруссия и Литва XV—XVI вв. М., 1961.